

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Ліда, 2021 г.*

***БЛАНК ЗАДАННЯЎ***

***Дарагія адзінаццацікласнікі!***

***У гэтым годзе споўнілася б 100 гадоў найвыдатнейшым беларускім пісьменнікам Івану Шамякіну і Івану Мележу – аўтарам кніг, на якіх вырасла ўжо не адно пакаленне беларусаў. Любая добрая кніга – гэта не проста твор мастацтва, а і надзвычайны чароўны свет, у падарожжа па якім мы і запрашаем!***

## 11 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.** Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.

*Максімальная колькасць балаў –* **6.**

*Выдаве(тс,ц)кая калегія (рэдкалегія) – орган, створаны для кіравання выданнем, абмеркавання і вырашэння ўсіх (прынцыпова)важных пытанняў. У склад калегіі, як правіла, уваходзяць дырэктар, галоўны рэдактар, іх наме(сн,стн)ікі, загадчыкі асноўных аддзелаў і рэдакцый, менедж(...)р або ка(м,мм)ерцыйны дырэктар, а таксама могуць быць уключаны заснавальнікі і кіраўнікі або прадстаўнікі ўстаноў ці арганізацый, якія садзейнічаюць выпуску друкаванай прадукцыі.*

| | |
|---|---|
| А | Размяркуйце наступныя словы па слупках у табліцы: *аддзелаў, рэдкалегія, загадчыкі, уваходзяць, рэдакцый, прадстаўнікі, прадукцыі.* |
| Б | Запішыце правільна наступныя словы, раскрыўшы дужкі: *менедж(...)р, наме(сн,стн)ікі, ка(м,мм)ерцыйны, выдаве(тс,ц)кая, (прынцыпова)важных.* |

**Заданне 2.** У кожным з прапанаваных радоў адзін элемент будзе лішнім паводле пэўнай лексічнай характарыстыкі. Запішыце лішні элемент і патлумачце Ваша рашэнне.

*Максімальная колькасць балаў –* **6.**

А. Ручка, пяро, аловак, стыль.

Б. Дыярыуш – дзённік, біяграфія – жыццеапісанне, мемуары – успаміны, апокрыф – фейк.

В. Ганаровы тытул – тытул кнігі, друкаваная кніга – раман у трох кнігах, спісы летапісу – спісы вучняў, літаратурны помнік – бронзавы помнік.

Г. Выдаўнічы, паліграфічны, друкарскі, рукапісны.

**Заданне 3.** Злачынца замкнуў каштоўныя кнігі ў сейф. Каб адамкнуць яго, трэба разгадаць кодавае слова. На шчасце, у спешцы злачынца забыў на стале аркуш паперы, на якім запісана зашыфраванае слова. Дапамажыце адчыніць сейф і дастаць адтуль кнігі.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

*Вядома, што немец Ёган Гутэнберг – вынаходнік кнігадрукавання. Адбылося гэта прыблізна ў 1445 годзе. Гутэнберг стварыў не толькі друкаваны станок, але і сплаў для друкаваных літар, словалітны апарат, разборны шрыфт. Таксама на яго рахунку распрацоўка спецыяльнага саставу друкарскай фарбы.*

*Біблія Гутэнберга – першая друкаваная кніга, створаная геніяльным немцам прыкладна ў пяцідзясятых гадах пятнаццатага стагоддзя. Гэта былі часы, калі царква мела вялікую ўладу. Нядзіўна, што прыкладна трэць усіх першадрукаваных кніг была прысвечана рэлігіі. У тыя гады ў кніг яшчэ адсутнічаў тытульны ліст.*

| | |
|---|---|
| А | Выпішыце з першага абзаца слова, якое ўтворана спосабам асноваскладання (асновасловаскладання) |
| Б | Выпішыце слова, якое мае наступную марфемную будову: ¬ ⌒ ^ □ ⌐ (прыстаўка, корань, суфікс, канчатак, постфікс) |
| В | Выпішыце слова, утворанае складана-бяссуфіксным спосабам |
| Г | Выпішыце з другога абзаца слова, якое мае дзве нулявыя марфемы |
| Д | Выпішыце ў пачатковай форме дзеяслоў, утвораны ад прыметніка |
| Е | Паводле пачатковых літар кожнага з указаных у прыведзенай паслядоўнасці папярэдніх слоў павінна атрымацца слова, якое мае значэнне “замкнутая грамадская групоўка, якая ахоўвае сваю адасобленасць і свае саслоўныя і групавыя прывілеі”. Запішыце гэта слова. Яно і будзе кодам для адкрыцця сейфа. |

**Заданне 4.** Займеннікі адыгрываюць важную тэкстаўтваральную ролю. Яны не толькі выконваюць уласцівую для іх замяняльную функцыю, але і ў значнай ступені дапамагаюць фарміраваць асноўную інфармацыю. Запоўніце табліцу на аснове выкарыстаных у прапанаваных сказах займеннікаў.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

А. Першая кніга, падобная да тых, што ёсць у сучасным свеце, была створана ў I стагоддзі да нашай эры. Але самымі першымі кнігамі ў свеце лічацца месапатамскія таблічкі, створаныя, па меркаванні навукоўцаў, больш за 5000 гадоў таму.

Б. Чытанне пашырае кругагляд, прымушае мозг актыўна працаваць, дазваляе адцягнуць увагу ад паўсядзённых праблем і прыемна правесці час. Пра ўсё гэта чалавецтву вядома ўжо далёка не першае стагоддзе.

В. У Сярэднія вякі бібліятэкі грамадскага карыстання выглядалі інакш, чым сёння. У Еўропе ўсе асобнікі кніг былі прыкаваныя ланцугамі да кніжных паліц. Даўжыня ланцуга была дастатковай, каб узяць кнігу і прачытаць яе за сталом. Такія меры прадпрымаліся з мэтай прадухіліць крадзеж кніг да XVIII стагоддзя.

Г. Беларускі магнат Рыгор Хадкевіч, які даўно марыў аб адкрыцці ўласнай друкарні, запрасіў П. Мсціслаўца і І. Федаровіча да сябе ў мястэчка Заблудаў (цяпер Беластоцкае ваяводства ў Польшчы) (з газет).

**Заданне 5.** Уявіце, што выставу старажытных кніг вы прапанавалі правесці 23 красавіка – у Сусветны дзень кнігі і аўтарскага права. Да прапанаванай часткі сказа прыдумайце працяг, каб атрымаліся, калі магчыма, складаназалежныя сказы з рознымі відамі дадзеных частак. Калі гэта немагчыма зрабіць, то патлумачце прычыну. Запоўніце табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

*Найлепшы дзень для арганізацыі выставы старажытнай кнігі – 23 красавіка,...*

**Заданне 6.** Прачытайце ўважліва тэкст. Рэдактар вельмі спяшаўся і не мог дасканала вычытаць яго, таму ў тэксце засталіся памылкі (магчыма, лексічныя, арфаграфічныя, граматычныя). У табліцу запішыце словы (спалучэнні слоў) з памылкай, выпраўце яе і патлумачце, чаму тут ёсць памылка.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

***Цікаўныя факты пра кнігі***

*Якія можна ўспомніць цікаўныя факты пра сучасныя кнігі? Даследванні паказалі, што асноўная маса наведвальнікаў кніжных магазінаў – людзі, якія ўжо пераступілі парог саракагоддзя. Прычым большую палову з гэтай масы складаюць прадстаўніцы прыгожага полу.*

*Цікаўныя факты пра кнігі сведчаць пра тое, што ў нашы дні вялікай папулярнасцю карыстаюцца аўдыёкнігі. Мала хто ведае, што яны былі прыдуманы чалавекам, які марыў з іх дапамогай падтрымаць сляпых і са слабым зрокам людзей. Запатрабаванасць электронных кніг была прадказана яшчэ ў шасцідзясятых гадах мінулага стагоддзя, гэты гонар належыць пісьменнікам-фантастам.*

*Навукоўцы сцвярджаюць, што цікавасць чытача да пэўнага твора пачынае зніжацца ўжо тады, калі ён дабіраецца да васямнаццатай старонкі. Аднак існуе кніга, якую ўсё ж прыйдзецца дачытаць да канца. Яна мае гаваркую назву: «Кніга, якая не можа чакаць». Дзецішча аргенцінскага выдавецтва сапраўды лепш усяго прачытаць адразу ж. У адваротным выпадку на працягу двух месяцаў зікнуць чарніла, пасля чаго чытачу прыйдзецца любавацца на пустыя старонкі.*

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

В Средние века производство книг сосредоточилось в монастырских скрипториях, где работало по 20-30 человек. Обычно самый грамотный из них читал книгу вслух, а остальные переписывали ее с голоса. Было и разделение труда: одни монахи просто копировали тексты, другие переписывали наиболее важные книги каллиграфическим почерком. Производительность труда одного переписчика не превышала четырех страниц в день. «Этот труд тяжел, – оставил один из монахов жалобу на полях переписанной им книги. – Он портит зрение, сгибает спину и заставляет болеть все тело. Как моряк, наконец возвращающийся в порт, писарь с нетерпением ждет момента, когда дойдет до последней строчки».

**Заданне 8.** Вызначце правільныя хэштэгі да наступных твораў. Запішыце нумары гэтых хэштэгаў у адпаведную графу. Улічыце, што ў кожным правільным хэштэгу ёсць указанне на жанр твора.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| *Мастацкі твор* | *Хэштэг да мастацкага твора* |
|---|---|
| "Непаўторная вясна" | 1. #раман_драматызм_Шамякін_вайна<br>2. #аповесць_рэалізм_Мележ_каханне<br>3. #аповесць_Шамякін_рэалізм_каханне<br>4. #сацыяльныраман_Мележ_постмадэрнізм_каханне<br>5. #сацыяльныраман_Шамякін_постмадэрнізм_каханне<br>6. #сацыяльныраман_Мележ_постмадэрнізм_вайна |
| "Людзі на балоце" | 1. #сацыяльныраман_Мележ_Палессе_рэалізм<br>2. #раман_рэалізм_калектывізацыя_псіхалагізм<br>3. #апавяданне_Нарач_Мележ_рамантызм<br>4. #апавяданне_Мележ_калектывізацыя_псіхалагізм |
| "Каласы пад сярпом тваім" | 1. #аповесць_Караткевіч_Каліноўскі_мадэрнізм<br>2. #раман_пярэдадзеньпаўстання_Караткевіч_гісторыя<br>3. #апавяданне_Загорскі_гісторыя_паўстанне<br>4. #гістарычныраман_дзядзькаванне_Караткевіч_вобразнаясімволіка<br>5. #гістарычныраман_Каліноўскі_Караткевіч_вобразнаясімволіка |
| "Зацюканы апостал" | 1. #вадэвіль_Макаёнак_умоўнасцьчасу_умоўнасцьмесца<br>2. #камедыя_Крапіва_умоўнасцьчасу_умоўнасцьмесца<br>3. #трагедыя_Макаёнак_канкрэтнасцьчасу_сімвалічнасцьвобразаў<br>4. #трагікамедыя_умоўнасцьчасу_умоўнасцьмесца_абагуленасцьвобразаў<br>5. #вадэвіль_умоўнасцьчасу_умоўнасцьмесца_абагульненасцьвобразаў |

**Заданне 9.** Урывак з тэксту аднаго з самых вядомых твораў класіка беларускай літаратуры быў паслядоўна перакладзены анлайн-перакладчыкам на некалькі моў і потым зноў на беларускую. Прачытайце тое, што атрымалася. Здагадайцеся, што гэта за твор і хто яго аўтар, узнавіце арыгінал урыўка і вызначце вершаваны памер арыгінала і ўрыўка (памятайце, што памер вызначаецца як колькасць стоп у вершаваным радку: 5-стопны ямб).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*



Вясновага лебедзя песня,
Выкіньце зімовыя міскі,
Платаны зашэпчуць калінай
Над змрочнай цяснінай ў даліне.

З'яўляецца лісце зялёным
Асоблівай мовай нябёсам:
Раса расплылася уранку,
Паўднёвае сонейка песціць.

**Заданне 10.** Уявіце сабе, што Вам трэба арганізаваць выставу, прысвечаную агульнавядомаму беларускаму пісьменніку, які адзначае ці адзначаў бы юбілей у 2020/2021 навучальным годзе. Прыдумайце творчую назву для гэтай выставы. Аргументуйце, чаму выставу Вы назвалі менавіта так. На чыстых вокладках укажыце тры кнігі, якія абавязкова павінны быць на гэтай выставе? Напішыце кароткія анатацыі да кожнай з гэтых кніг, каб творы выбранага Вамі пісьменніка захацелі прачытаць аднакласнікі.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

